УДК 37(476):331.361:94(476)

**Н. М. Якуш**, кандыдат гістарычных навук, дацэнт (БДТУ)

# АРГАНІЗАЦЫЯ НАВУЧАЛЬНАЙ СІСТЭМЫ ПАВЫШЭННЯ ТЭХНІЧНАЙ КВАЛІФІКАЦЫІ РАБОЧЫХ СЕЛЬСКАГАСПАДАРЧАЙ ВЫТВОРЧАСЦІ БССР У 1976–1985 ГГ.

У артыкуле даследавана сістэма курсавай падрыхтоўкі і перападрыхтоўкі кваліфікаваных кадраў тэхнічных рабочых спецыяльнасцей аграпрамысловага комплексу. Прааналізаваны стан нарматыўнай вучэбна-матэрыяльнай базы курсавых камбінатаў і пунктаў Дзяржкамсельгастэхнікі БССР і непасрэдна ў гаспадарках. Разгледжаны напрамкі метадычнай работы па навучанні курсантаў індустрыяльным тэхналагіям сельгасвытворчасці, павышэнні прафесійнага ўзроўню выкладчыкаў, спецыялізацыі навучальнага працэсу. Пададзены пытанні арганізацыі масавага тэхнічнага ўсенавуча.

The system of course preparation and re-training of technical personnel working in the agricultural sector is studied in the paper. The state of regulatory base and training facilities of training centers and offices under the Goskomselhoztehnika of BSSR and in households was studied. The direction of methodical work aimed to cadets' training in the field of industrial agricultural technologies, improving of teachers' qualification level, specialization of training process was analyzed. The questions concerning the technical organization of mass compulsory education are developed.

**Уводзіны.** Аграрная палітыка Беларускай ССР у 1970–80-я гг. была звязана з пераводам сельгасвытворчасці на прынцыпова новы навукова-тэхнічны і арганізацыйны ўзровень, фарміраваннем складанай вытворча-эканамічнай сістэмы – аграпрамысловага комплексу. Сацыяльным рэзервам росту прадукцыйнасці сельскагаспадарчай працы становіліся рабочыя кадры новай тэхналагічнай культуры, падрыхтаваныя да працы на энерганасычанай тэхніцы. Задача стварэння ўмоў для падрыхтоўкі высокакваліфікаваных кадраў тэхнічных рабочых спецыяльнасцей і арганізацыі магчымасцей сістэматычнага павышэння ўзроўню іх прафесійнага майстэрства стала надзённым клопатам партыйнага і савецкага кіраўніцтва рэспублікі.

**Асноўная частка.** Адным з кірункаў стварэння сістэмы павышэння тэхнічнай кваліфікацыі рабочых сельгасвытворчасці выступіла арганізацыя спецыяльных курсаў непасрэдна ў гаспадарках і пры аддзяленнях Дзяржкамсельгастэхнікі. Партыйныя камітэты, сельскагаспадарчыя органы распрацавалі і прынялі да выканання перспектыўныя планы, якія вызначылі колькасны склад слухачоў курсаў, кола прафесій, звязаных з дынамічным прагрэсам навукі, стратэгію ўдасканалення форм і метадаў навучання.

Важнейшай перадумовай выканання гэтых планаў было развіццё і ўмацаванне нарматыўнай вучэбна-матэрыяльнай базы курсавой падрыхтоўкі сельскагаспадарчых рабочых. Распачалося адпаведнае будаўніцтва вучэбна-курсавых камбінатаў усіх узроўняў, стварэнне навучальных пунктаў і класаў. У 1985 г. павышэнне тэхнічнай кваліфікацыі рабочых калгасаў і саўгасаў ажыццяўлялі рэспубліканскі, шэсць абласных і адзін міжраённы на базе Нясвіжскай райсельгастэхнікі гасразліковых вучэбна-курсавых камбінатаў, 117 пунктаў райаб'яднанняў сельгастэхнікі, дзе налічвалася 509 стацыянарных класаў, шырокая сетка класаў і кабінетаў непасрэдна ў гаспадарках [1].

Гэтая разгалінаваная сетка забяспечвала падрыхтоўку рабочых масавых прафесій для сяла і перакваліфікацыю кадраў з улікам працэсаў шырокага кааперавання і аграпрамысловай інтэграцыі. На курсах механізатарскія кадры займаліся вывучэннем новай тэхнікі і перадавой тэхналогіі сельскагаспадарчай вытворчасці.

Аб важнасці пытання ўздыму тэхнічнай кваліфікацыі вёскі сведчыць той факт, што ў цэнтральным, абласных, раённых апаратах Дзяржкамсельгастэхнікі БССР былі ўведзены пасады намеснікаў старшынь і ўпраўляючых па перападрыхтоўцы кадраў механізатараў і тэхнічнаму ўсенавучу, дырэктараў і намеснікаў дырэктараў вучэбна-курсавых камбінатаў. Навучальны працэс ажыццяўлялі метадысты, майстры вытворчага навучання і выкладчыкі з ліку спецыялістаў і кіруючых работнікаў з вышэйшай і сярэдняй спецыяльнай адукацыяй. Для выкладання на курсах, арганізуемых у калгасах і саўгасах, прыцягваліся спецыялісты аграпрамысловага комплексу, выкладчыкі вну, тэхнікумаў, сельскіх прафтэхвучылішчаў, перадавікі вытворчасці. Для каардынацыі іх метадычнай працы ў кожным сельскім раёне была ўведзена пасада метадыста па тэхнічным ўсенавучы. Павышэнне педагагічнага майстэрства арганізатараў і выкладчыкаў, занятых у сістэме курсавой перападрыхтоўкі кадраў вёскі, праводзілі Усесаюзны інстытут павышэння кваліфікацыі кіруючых работнікаў Дзяржкамсельгастэхнікі СССР, Рэспубліканскі інстытут павышэння кваліфікацыі работнікаў прафтэхадукацыі, школы перадавога вопыту

і метадычныя курсы, якія працавалі пры аблсельгастэхніках і эканамічна моцных гаспадарках.

Высокі ўзровень навучання слухачоў забяспечвалі тыя вучэбна-вытворчыя пункты і цэнтры, дзе існавалі класы поўнай механізацыі і класы-цэхі для падрыхтоўкі спецыялістаў патрабуемай кваліфікацыі, дзе актыўна дзейнічалі метадычныя саветы са складам спецыялістаў высокай адукаванасці і прафесійнага майстэрства. Такія прыклады дэманстравалі Слонімская, Мастоўская, Свіслацкая райсельгастэхнікі, Гродзенскі абласны вучэбны цэнтр [2]. Высокая якасць тэхнічнай падрыхтоўкі кадраў у сістэме Гродзенскага абласнога аб'яднання сельгастэхнікі пацвярджалася валіфікацыйным майстэрствам тых сельскіх працаўнікоў, што прайшлі праз яго сістэму курсаў. Аб гэтым сведчыў факт перавагі сярод механізатараў трактарыстаў-машыністаў першага і другога класа, якіх налічвалася ў 1983 г. 17 тысяч, ці 70,4% ад агульнай колькасці [3].

Паляпшэнне падрыхтоўкі кадраў у курсавой сістэме Дзяржкамсельгастэхнікі дасягалася таксама за кошт удасканалення форм навучання. У прыватнасці, шырокае распаўсюджванне атрымала настаўніцтва. Гэтая форма паказала найбольшую эфектыўнасць пры падрыхтоўцы вадзіцеляў аўтамабіляў, слесараў і навучанні механізатараў навыкам эксплуатацыі новай сельскагаспадарчай тэхнікі. Яна набыла папулярнасць, таму ва ўсіх спецаддзяленнях сельгастэхнікі былі ўведзены вызваленыя пасады настаўнікаў з ліку лепшых шафёраў, трактарыстаў, камбайнераў.

Добра зарэкамендавала сябе і такая новая форма павышэння кваліфікацыі, як падрыхтоўка і перападрыхтоўка аператараў машыннага даення на месцах праз спецыяльныя выязныя перасоўныя вычэбныя класы. У 1985 г. падобныя класы працавалі ў 75 раёнах рэспублікі. З іх дапамогай пачалі рыхтаваць і майстроўналадчыкаў па абслугоўванні тэхнічнага абсталявання жывёлаводчых комплексаў [4].

У 1980-х гг. пачалася пэўная спецыялізацыя навучальнай сеткі. Яе ініцыятарам выступілі віцебскія абласныя ўпраўленні сельскай гаспадаркі і сельгастэхнікі. Сумесным загадам яны вызначылі месцы і тэрміны перападрыхтоўкі механізатараў для работы на новай тэхніцы. Асваенне К-701 было арганізавана на базе Полацкай райсельгастэхнікі, КСК-100 – на Чашніцкім вучэбным пункце, КПС-5Г, Е-280, Е-301 на базе абласнога вучэбнага камбіната. Вынікі падрыхтоўкі сведчылі аб перспектыўнасці такога накірунку. За даследуемы перыяд курсавая сетка навучальных пунктаў Дзяржкамсельгастэхнікі БССР унесла найбольш значны ўклад у справу павышэння тэхнічнай кваліфікацыі сельгасрабочых.

Важную задачу выконвалі і курсы пры калгасах і саўгасах, арыентаваныя на павышэнне ўзроўню прафесійнага майстэрства працаўніка вёскі непасрэдна ў працэсе вытворчасці. За 1976–80 гг. значна палепшылася абсталяванне вучэбных класаў гаспадарак тэхнічнымі сродкамі навучання. У гэтых мэтах Міністэрства сельскай гаспадаркі Беларускай ССР размясціла заказ на камплекты абсталявання на Харкаўскім трактарна-вытворчым аб'яднанні. Сістэматычна вяла пастаўкі вучэбнай тэхнікі і рэспубліканская кантора забеспячэння і камплектацыі. Сярод тэхнічных навучальных сродкаў пераважалі вылічальныя машыны, тэлевізары, дыя- і кінапраектары, кадрапраектары, магнітафоны, дыяфільмы, якія дазвалялі эфектыўна выкарыстоўваць падчас заняткаў інструктыўна-тэхналагічную і справачную літаратуры аб дасягненнях агратэхнічнай навукі. Гэта давала магчымасць не толькі рэгулярна і арганізавана праводзіць заняткі па павышэнні кваліфікацыі механізатараў і жывёлаводаў, але і дазваляла набываць новыя тэхнічныя спецыяльнасці. Створаная вучэбная база рабіла магчымай таксама арганізацыю ў лепшых гаспадарках школ перадавога вопыту, звязаных з укараненнем у вытворчасць індустрыяльных тэхналогій і перадавых прыёмаў працы. Рашэннем Гродзенскага АК КПБ былі створаны раённыя школы ў калгасе імя 50-годдзя СССР – па вырошчванню высокіх ураджаяў зернавых культур, у калгасе імя Леніна – цукровых буракоў, у саўгасе «Ваўкавыскі» – бульбы, на ферме «Ендрыхоўцы» племзавода «Рось» – школа навучання машыннаму даенню [5]. Згодна з пастановай Віцебскага АК КПБ, школы перадавога вопыту былі арганізаваны на базе гаспадарак, жывёлагадоўчых комплексаў і ферм, у якіх існавала практыка галіновай (цэхавай) структуры кіравання вытворчасцю, двухцыклічнага рэжыму работы і пааперацыйнага падзелу працы. Рашэннем бюро Гомельскага АК КПБ была створана школа праслаўленага камбайнера, Героя Сацыялістычнай Працы Г. М. Катлярова. У 1979 г., напярэдадні жніва метады Катлярова вывучылі звыш 500 механізатараў і інжынерна-тэхнічных работнікаў з усіх раёнаў рэспублікі [6]. З 1979 года школы па тыпу школы Катлярова пачалі арганізоўвацца паўсюдна. У іх ішло вывучэнне прыёмаў працы лепшых рэспубліканскіх механізатараў, кіраўнікоў кармаўборачных атрадаў, жывёлаводаў. Набылі вядомасць і аўтарытэт школа У. І. Дзергачова – трактарыста-машыніста механізаванага атрада Кармянскай райсельгастэхнікі і аператара машыннага даення Брэсцкага раёна Л. Д. Брызгі. Штогод у рэспубліцы дзейнічала звыш 400 школ перадавога вопыту [7].

Адным з напрамкаў павышэння індустрыяльнага ўзроўню агракультуры на беларускай вёсцы стала справа арганізацыі масавага тэхнічнага ўсенавуча. З пачатку 1960-х гадоў у БССР пачалі дзейнічаць школы механізатарскага ўсенавуча, якія ў асноўным рашалі задачу падрыхтоўкі дадатковага рэзерва механізатараў, неабходнага на перыяды найбольш напружаных сельскагаспадарчых работ. Аднак арганізацыйныя цяжкасці і слабасць вучэбна-вытворчай базы прывялі да скарачэння маштабаў усеагульнага навучання механізатарскім прафесіям. Актыўнае вяртанне да ідэі тэхнічнага ўсенавуча ў даследуемыя гады было прадыктавана як вострым дэфіцытам механізатарскіх кадраў, так і новым узроўнем матэрыяльна-тэхнічнай базы сельскай гаспадаркі, ростам энергаўзброенасці вёскі. Уцягванне моладзі і ўсяго працаздольнага насельніцтва ў навучанне механізаваным прафесіям ішло пад лозунгам «жывеш на вёсцы – валодай тэхнікай». З гэтай ініцыятывай у 1978 г. да моладзі рэспублікі звярнуліся камсамольцы калгаса імя Куйбышава Кіраўскага раёна Магілёўскай вобласці.

Характэрнай рысай механізатарскага ўсенавуча стаў шырокі ўдзел прамысловых прадпрыемстваў ў падрыхтоўцы рэзерву тэхнічных кадраў для сяла. Па праграмах усенавуча рыхтаваліся кадры масавых прафесій для сельскай гаспадаркі з ліку рабочых гродзенскіх заводаў карданных валоў і гандлёвага машынабудавання, віцебскага ільнокамбіната і завода лёгкага машынабудавання, інструментальнага і станкабудаўнічых заводаў Оршы. За 1976–80-я гг. праз гурткі механізатарскага ўсенавуча атрымалі пэўную спецыяльную тэхнічную падрыхтоўку дзясяткі тысяч сельскіх і гарадскіх жыхароў. У пэўнай меры гэта дазваляла вырашаць дзве задачы: забяспечыць кадравы рэзерв для работы на сельскагаспадарчай тэхніцы ў напружаныя вясенне-асеннія перыяды палявой працы і ўзняць узровень прафесіяналізацыі сельскіх жыхароў. Але ў цэлым уцягванне ў тэхнічны ўсенавуч шырокага кола служачых і інтэлігенцыі вёскі і горада аказалася неапраўданым і немэтазгодным з эканамічнага пункту гледжання. Вельмі часта гэта прыводзіла толькі да адрыву вялікай колькасці людзей ад непасрэднай справы і дарэмнай траты імі рабочага часу. Рэальны рэзерв тэхнічных кадраў фарміраваўся толькі са слесараў-рамонтнікаў сельскагаспадарчай тэхнікі і рабочых машынабудаўнічых прадпрыемстваў гарадоў.

**Заключэнне.** Відавочна, што эфектыўнасць курсавой формы навучання сельскагаспадарчых рабочых у многім залежала ад тэхнічнага і агульнаадукацыйнага ўзроўню слухачоў, узгодненасці планаў перападрыхтоўкі ў розных звёнах сістэмы, пераадоленасці ведамасных бар'ераў, усталяванні адзінага метадычнага кіраўніцтва вучэбным працэсам. Як бачна з даследавання, у такім напрамку і разгортвалася арганізацыйная работа па забеспячэнні новага тэхніка-тэхналагічнага ўзроўню агракультурнага развіцця беларускай вёскі. У 1976–85 гг. былі закладзены арганізацыйныя і матэрыяльна-тэхнічныя асновы для падрыхтоўкі і перападрыхтоўкі тэхналагічна і прафесійна адукаваных сельскагаспадарчых рабочых. Аднак у цэлым працэс павышэння тэхнічнай кваліфікацыі ў гэты час не набыў устойлівых характарыстык адзінасці і непарыўнасці. Пры планаванні кантынгентаў навучэнцаў і слухачоў пераважалі мясцовыя надзённыя патрэбы, неставала дзейсных сувязей паміж сельскімі школамі, прафтэхвучылішчамі, вучэбна-курсавымі камбінатамі Дзяржкамсельгастэхнікі і гаспадаркамі, адсутнічалі адзіныя тыпавыя вучэбныя праграмы і планы павышэння кваліфікацыі з улікам адукацыі сельскагаспадарчых рабочых, вопыту іх работы, навучання ў міжшкольных навучальна-вытворчых камбінатах і сярэдніх прафтэхвучылішчах аграпрамысловага комплекса.

## Літаратура


1. Нацыянальны архіў РБ. Ф. 1260. Воп.1. С. 1810. Л. 65.
2. Сельская газета. 1979. 13 ноября.
3. Сельское хозяйство Белоруссии. 1983. № 8. С. 5.
4. Нацыянальны архіў РБ. Ф. 1260. Воп. 1. С. 1810. Л. 96.
5. Дзяржаўны архіў Гродзенскай вобласці. Ф. 1. Воп. 79. С. 4. Л. 20.
6. Звезда. 1979. 8 февраля.
7. Сельское хозяйство Белоруссии. 1983. № 8. С. 7.


*Паступіў 14.03.2014*